# ВЕРА ВАЛКОВІЧ – СТВАРАЛЬНІЦА ТЭАРЭТЫЧНЫХ АСНОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ
# VERA VALKOVICH – CREATOR OF THE THEORETICAL FOUNDATIONS OF NATIONAL EDUCATION

Светлана Снапковская,
доктор исторических наук, доктор педагогических наук,
профессор кафедры культурологии факультета социокультурных коммуникаций Белорусского государственного университета
Минск, Беларусь

Ключавыя словы: нацыянальная школа, выхаванне, ідэалы і каштоўнасці адукацыі, асоба, індывідуўм, сістэма адукацыі.

Рэзюме. У артыкуле разгледжаны навуковыя погляды В. А. Валковіч у галіне філасофіі, педагогікі і псіхалогіі. Паказана канцэпцыя нацыянальнай адукацыі, распрацаваная В. А. Валковіч у пачатку ХХ ст., выяўлены асноўныя знешнія і ўнутраныя фактары, якія ўплывалі на пераўтварэнне нацыянальнага тыпу ў нацыянальны ідэал.

Keywords: national school, upbringing, ideals and values of education, personality, individual, educational system.

Summary. The article considers the scientific views of V. A. Volkovich in the field of philosophy, pedagogy and psychology. The concept of national education developed by V. A. Valkovich at the beginning of the XX century, the main external and internal factors that influenced the transformation of the national type into the national ideal are identified.

Вера Анікфееўна Валковіч (1874-1962) – педагог, філосаф і псіхолаг беларуска-нямецкага паходжання. Бацька – Анікфей Іванавіч быў сапраўдным стацкім саветнікам, начальнікам Гродзенскага ўправлення Дзяржаўнай маёмасці [5, с.249]. Прадзед В.А.Валковіч - Марцін фон Асмус быў вядомым педагогам, уладальнікам жаночага пансіёна ў Дзерпце і пляменнікам ангельскага мораплаўца і даследчыка Джэймса Кука. В.А.Валовіч - аўтарка навуковых прац, выдадзеных у пачатку ХХ ст. у Санкт-Пецярбургу, удзельніца міжнародных кангрэсаў па народнай адукацыі і грамадскаму выхаванню, старшая сястра міласэрнасці санітарнага цягніка падчас Першай сусветнай вайны. В.А.Валковіч з’яўлялася членом Санкт-Пецярбургскага Філасофскага аб’яднання. У гады савецкай улады атрымала ступень кандыдата педагагічных навук.

Знаёмства з навуковай спадчынай Веры Валковіч адбылося дзесяць год назад падчас працы аўтара ў фондах Навукова-даследчага аддзела рукапісаў Расійскай дзяржаўзнай бібліятэкі ў Маскве. Фонд В.А.Валковіч, які ўтрымлівае больш за 400 адзінак захоўвання, у значнай ступені знаёміць нас з навукова-тэарэтычнай спачынай нашай суайчынніцы і пераканаўча сведчыць пра яе высокія навуковыя дасягненні пачатку ХХ ст.

Пасля заканчэння ў 1896-1900 гг. гісторыка-філалагічнага факультэта Вышэйшых жаночых курсаў у Пецярбургу В.А.Волкович прапанавалі працу пры кафедры псіхалогіі. У 1907 г. яна пачала працаваць памочніцай

выкладчыка Жаночага Педагагічнага інстытута, адчыненага з 1903 г., і які з 1912 г. атрымаў статус вышэйшай навучальнай установы. З 1901 по 1907 гг. сувмесна з педагогам і калегай З.К.Сталіцай вяла ў часопісе "Вопросы философии и психологии" аддзел крытыкі і бібліяграфіі, пісала рэцэнзіі на артыкулы часопісаў "Revue Philosophique" і "Zeitshrift fuer Philosophic". На працягу 1908-1912 гг. яна прымала ўдзел у чатырох міжнародных кангрэсах па псіхалогіі і педагогіцы, а ў летній семестр 1905 г. слухала в Берлінскім універсітэцее лекцыі па філасофіі.

Галоўнае ў творчай спадчыне В.А.Валковіч – распрацоўка філасофіі новай школы ў кнізе "Педагогіка - навука перад судом яе праціўнікаў" (СПб.-М., 1909). У працы "Нацыянальнае выхаванне як задача гарманічнага развіцця" (1912 г.) В. А. Волкавіч раскрывае фактары нацыянальнага выхавання і вызначае яго асноўныя этапы. Разуменне нацыянальнага тыпу як ўстойлівай надіндывідуальнай «народнай самасці» прыводзіць В. А. Валковіч да сцвярджэння неабходнасці вывучэння і аб'яднання ў адно цэлае ўсіх характэрных рысаў нацыі, як прыроджаных і наследаваных ў галіне інтэлекту, пачуццяў і волі, якімі вывучаемая нацыя адрозніваецца ад іншых нацый [2, л. 7]. А гэтая нацыянальная індывідуальнасць выяўляецца, перш за ўсё, псіхалагічнымі прыкметамі: мовай; рэлігіяй; паэзіяй, мастацтвам і меркаваннямі [2, л.11]. Таму нацыянальныя героі, рэлігія, мова, літаратура, гісторыя, помнікі мастацтваў, у якіх выяўляецца асабістае жыццё народа, норавы, звычаі павінны быць вывучаны ў мэтах выяўлення і высвятлення нацыянальнага тыпу [2, л. 12].

Пастулюючы значнасць роднай мовы як асновы нацыянальнага тыпу, В. А. Валковіч звяртаецца да прац педагога К. Д. Ушынскага, які паклаў у аснову першапачатковага навучання родную мову, цесна з ёй звязваючы і групуючы вакол яе ўсе астатнія прадметы навучання. Да гэтай ключавой ідэі яна звяртаецца ў сваім артыкуле “Аб значэнні Ушынскага і яго “Роднага слова”. У гісторыі вывучэння і выкладання айчыннай мовы яна разглядае працу Ушынскага, галоўным чынам, з боку яго тэарэтычных асноў. “Практычнае значэнне гукавага метаду, прыкмечанае Ушынскім, падказанае яму здаровым сэнсам і блізкасцю да жыцця, несумненна. Ушынскі першым за літарай прымеціў гук, які, як жыццёвы пачатак, паклаў у аснову свайго метаду. Гэта адкрыццё - штуршок, дадзены ім развіццю лінгвістыкі, зроблены быў Ушынскім хутчэй паўсвядома, чым свядома, так як ён ставіў сабе практычныя мэты. Сваім гукавым метадам вызначыў універсітэцкую навуку... Па рукапісах аднавіць гукавы склад слоў мовы - задача, якую паставіла сабе навука” [3, л. 185].

У 1903 г. В.А.Валковіч сумесна з калегай З.К.Сталіцай адкрыла ў Санкт-Пецярбургу “Філасофскія курсы”, якія паводле задумы арганізатараў павінны былі спрыяць “пабудове агульнага філасофскага і педагагічнага светапогляду”. Дасягнуць мэты меркавалася з дапамогай лекцый і семінарскіх заняткаў, якія пачыналіся ў 19 гадзін. У рамках курса “Уводзіны ў філасофію” яна знаёміла слухачоў з разнастайнамі тэарэтычнымі і прыкладнымі пытаннямі філасофіі і педагогікі.

Праблематыку “Новай педагогікі”- ўласных навуковых здабыткаў - В. А. Валковіч не толькі ўключыла ў свой курс “Увядзенне ў філасофію”, але працягвала распрацоўваць у іншых творах. Яна адстойвала свае ідэі ў кнізе “Педагогіка - навука перад судом яе праціўнікаў” (СПб.-М., 1909), дзе аўтар раскрывае “філасофію новай школы”. У кнізе “Сябар чалавецтва М.І.Пірагоў (Да 100-годдзя з дня нараджэння: 1810-1910)” (СПб., 1910) Валковіч адзначае: “Мы глядзім на гісторыю педагогікі, як на навуку, якая павінна дапамагчы нам выпрацаваць філасофію новай школы”. Праблемам выхавання яна прысвяціла шэраг артыкулаў і раздзелы у манаграфіях.

У 1907 – 1912 гг. выйшлі працы В. А. Валковіч: “Аб рэлігійным выхаванні” ("Стагоддзе", 1907, N12); “Рэлігійнае выхаванне і адукацыя” (“Выхаванне і навучанне",1908,б. н.); “Барацьба з песімізмам” ("Выхаванне і навучанне", СПб., 1908); “Аб развіцці самадзейнасці ў сярэдняй школе” (“Выхаванне і навучанне”,1909, N8); “Кніга для бацькоў. Выхаванне маральнасці ў падрастаючым пакаленні” (“Руская школа”, 1909, N4); раздзел “Задачы грамадскага выхавання” у кнізе "Будучыня ў нашых руках" (СПб., 1910); “Развіццё ў дзецях жыццярадаснасці і барацьба з песімізмам” (СПб., 1912); “Выпрацоўка характару" (СПб.-М., 1912) і інш.

Гэтыя навукова-педагагічныя ідэі яна абмяркоўвала не толькі з калегамі, але і ў бацькоўскім калектыве. Так, на гадавым сходзе С.-Пецярбургскага бацькоўскага гуртка 17 сакавіка 1907 г. В. А. Волкавіч выступіла са сваім праектам стварэння новай, ідэальнай школы, распрацаванай на падставе “Філасофіі новай школы”, паколькі толькі гэтая філасофія здольная даць суцэльны светапогляд і вядучую педагагічную ідэю. В. А. Волкавіч прапануе свой метад пабудовы гісторыі педагогікі, якая будзе строгай навукай, здольнай даць матэрыял для фарміравання “праўдзівага жыццёвага” светапогляду, які складае як бы дух школы. Прытрымліванне яе метаду пабудовы навукі - гісторыі педагогікі патрабуе, па-першае, аналітычнага раскрыцця элементаў светапогляду народа праз разгляд гістарычнай перспектывы поглядаў на справу выхавання, па-другое, указанні на пэўны характар гэтых элементаў і, па - трецце, выкрыццё псіхалагічнай падасновы дадзеных элементаў.

З'яўленне на Русі хрысціянства В. А. Валковіч вызначае як момант культурных клопатаў чалавецтва аб асобным чалавеку па запаветах першавыхавальніка Хрыста. "Наша старажытная педагогіка, - піша Валковіч, - падпарадкоўваючы асобу царкве, тым жа часам вылучыла "людскасць", гэта значыць ўсеагульную адукацыю, выхаванне чалавека, роўнае для ўсіх, ідэалістычнае і дэмакратычнае па прынцыпе XIV ст., вылучыла (наша старажытная педагогіка - С. С.) выхавальніка духу рускага народа Сергія Раданежскага " [4, л.297]. Татарскае ярмо падзяліла Русь на паўночны ўсход і паўднёвы захад. Паўднёва-заходнія брацтвы - з Магілёўскай Акадэміяй і граматыка-лаціна-славянскай Акадэміяй. Валковіч адзначае імкненне рассунуць прынятыя гатовыя формы езуіцкага выхавання да аўтаномных, свабодных, калегіяльных устаноў.

Асабліваю занепакоенасць у В. А. Валковіч выклікае няведанне нацыяй уласнай паэзіі і мастацтва. Яна падкрэслівае, што гэтым няведаннем саслабляецца «нацыянальны тып», узнікае небяспека размывання «нацыянальнай самасці». В. А. Валковіч паказвае прамую залежнасць матэрыяльнага дабрабыту народа ад ўзроўня гісторыка-культурных ведаў. Яна прыводзіць словы Ушынскага, які ў сваёй "Справаздачы камандзіраванага для агляду замежных жаночых навучальных установ" адзначаў: "Самая галоўная рыса, якая адрознівае рускага адукаванага чалавека ад замежніка, гэта тая, што рускі вельмі дрэнна ведае сваю Айчыну, параўнальна нават з малаадукаваным швейцарцам, французам, немцам, ангельцам. Француз перанясе вам Маскву на бераг Балтыйскага мора, але сваю Радзіму, сваю гісторыю, яе вялікіх пісьменнікаў ён абавязкова ведае; рускі апіша вам падрабязна Лондан, Парыж і нават Калькуту і задумаецца, калі спытаць у яго, якія гарады стаяць на Аке. Да таго часу, пакуль мы не ведаем сваёй Радзімы..., мы не будзем у стане скарыстацца і тымі сродкамі, якія даюць нам прырода і насельніцтва краіны, і будзем бедныя, таму што неадукаваныя. *Колькі нашых кампаній на акцыях заплацілі банкруцтвам за сваё няведанне роднай краіны і яе патрэбаў!* Перш за ўсё, ... неабходна звярнуць нашу школу да народнасці [6, с.260].

Такім чынам, высвятленне нацыянальнага тыпу складае, перш за ўсё, задачу псіхалагічнага, прыродазнаўчага і гістарычнага даследавання. Як адзначалася вышэй, другі этап нацыянальнага выхавання ў педагагічнай сістэме В. А. Валковіч звязаны з выяўленнем нацыянальнага ідэалу. Высвятленне нацыянальнага тыпу прыводзіць нацыю да самасвядомасці, а затым і да самапазнання, а высвятленне нацыянальнага ідэалу і супастаўленне яго з нацыянальным тыпам абумоўлівае самавызначэнне і самавыхаванне нацыі [2, л.13]. Ідэал чалавека, - універсальны ідэал - устанаўлівае правільныя творчыя ўзаемаадносіны паміж сваім і чужым у жыцці нацыі, паміж нацыяналістамі і касмапалітамі, прычым у жыцці нацыі гэта зусім не прадугледжвае абавязковую варожасць [1, л .9].

В. А. Валковіч вылучае і абгрунтоўвае тры фактары, якія ўплываюць на станаўленне і развіццё нацыянальнага выхавання: цэнтрычны, альтруістычны, універсальны. Нацыянальнае выхаванне, лічачыся з яго цэнтрычным - тып у сабе і для сябе, альтруістычным – жыць у іншых і для іншых, універсальным - жыць для ўсіх, для вышэйшай праўды, для бога - фактарамі ператтварае нацыянальны ідэал шляхам знішчэння або замены слабасцяў, недахопаў сілай і якасцямі, гэта значыць, патрабуючы – маральна паляпшае [2, л.14].

Так, цэнтрычны фактар выяўляецца ў моманты гістарычных узрушэнняў, падпарадкоўваючыся інстынкту самазахавання, выступае часта як непазбежны нацыянальны шавінізм [2, л. 16]. У моманты нацыянальных бедстваў нацыя больш вастра адчувае свае абавязкі і пачынае выпрацоўваць сумеснымі намаганнямі больш інтэнсіўнае асабістае жыццё для ўзняцця нацыі [2, л. 17].

Альтруістычны фактар, наадварот, выходзіць на першы план у моманты нацыянальнага дабра, нацыянальных сіл і нацыянальнага самавызначэння, і нацыя служыць іншым больш, чым сабе, часам нават у шкоду сабе. Дадзеная сітуацыя выліваецца ў бясплодны касмапалітызм нацыі [2, л.18].

У псіхалогіі нацыі, падкрэслівае В. А. Валковіч, немінуча чаргуюцца ў жыцці эгаістычны і альтруістычны элементы, прычым розныя гістарычныя эпохі вылучаюць мацней то адзін, то іншы з іх. У залежнасці ад характару эгаістычнага элемента нацыянальнае прымае форму здаровага або балючага жыцця, у сувязі з чым, павінна адбывацца тая ці іншая адзнака нацыянальнага [1, л.9].

Універсальны фактар станаўлення нацыянальнага ідэалу з'яўляецца залогам ажыццяўлення агульнакультурных задач богачалавечага ідэалу праз маляўнічую індывідуальную самасць. Валкавіч піша, што практычная прыстасоўвальнасць нацыянальнага выхавання да ўніверсальнага ідэалу будучыні, як зададзенай задачы нацыі, выклікаецца неабходнасцю натуральна - гістарычных умоў жыцця, апраўдваецца разуменнем і ўзгадняецца з маральнымі патрабаваннямі чалавека да нацыі, з прычыны таго, што ў нацыянальным выхаванні маральная і прававая задачы скрыжоўваюцца, амаль уваходзяць адна ў адну [2, л. 19].

Валковіч лічыць, што менавіта школа павінна быць прызнана найлепшым сродкам ўвасаблення нацыянальнага ідэалу ў жыццё [2, л. 21]. У такой школе нацыя, захоўваючы індывідуальную самасць, будзе забяспечана ад пагрозы касмапалітызму і агрэсіўна эгаістычнага шавінізму [2, л. 22]. Быць грамадзянінам свету, паводле В. А. Валковіч, можна толькі будучы ўпісаным у нацыянальнае паданне, паглыбіўшыся ў яго, а праз гэта спазнаючы яго агульначалавечы сэнс. Але і, з іншага боку, быць сапраўдным грамадзянінам свайго народа можна толькі праз рэалізацыю ў ім ідэалу чалавечнасці. “Вось чаму праўдзівы касмапалітызм і праўдзівы нацыяналізм, як гэта знаходзіць і Ул. Салаўёў, не толькі не супярэчаць адзін аднаму, але і “патрабуюць адзін аднаго”. Такія пісьменнікі, як Пушкін, Шэкспір, Гётэ - нацыянальныя і, разам з тым, агульначалавечыя. Нездарма Тютчаў пісаў аб Гётэ: “На дрэве чалавецтва высокім ты лепшым быў яго лістом”. І.А. Герцэн пра заходнікаў і славянафілаў выказаўся такім чынам: “Падобна Янусу, яны глядзелі ў розныя бакі, але сэрца білася ў іх адно”. Аднак неабходна высветліць стаўленне нацыянальнага ідэалу да ўніверсальнага, паказваючы на абмежаванасць нацыянальнага ідэалу і на ролю універсальнага ідэалу ў якасці рэгулятыўнага прынцыпу пры стварэнні, росце і развіцці нацыянальнага ідэалу” [1, л.9].

Трэці з выдзеленых Валковіч этапаў нацыянальнага выхавання заключаецца ў пошуку сродкаў звароту нацыянальнага тыпу ў нацыянальны ідэал. Вучоны адзначае, што задача звароту нацыянальнага тыпу ў нацыянальны ідэал як нарматыўная задача, як задача жыцця палепшыць і маральна падняць нацыю, ясна выяўляе сувязь нацыянальнага выхавання з задачамі маральнага выхавання, так як нацыянальнае выхаванне ёсць не што іншае, як маральнае паляпшэнне нацыі на шляху ажыццяўлення ідэалу [2,

л.6]. Пошук сродкаў звароту тыпу ў ідэал - этыка-педагагічная задача, рашэнне якой прыводзіць да самавызначэння і самавыхавання нацыі. У гэтай сувязі Валковіч прапануе вырашаць псіхалагічную і этычна-педагагічную задачы, памятаючы пра іх суіснаванне [1, л. 9]. Нацыянальнае выхаванне як задача індывідуальна-грамадзянскага выхавання, гэта значыць грамадскага выхавання, неабходна ва ўсякія часы, хоць формы яго змяняюцца і вар'іруюцца, адпаведна з агульнакультурным развіццём нацыі [2, л. 2].

У кантэксце актуалізацыі айчыннага навукова-педагагічнага вопыту разгляд і інттэрпрытацыя педагагічнай спадчыны вучонага - педагога пачатку ХХ ст. В.А.Валковіч з’яўляецца найбольш рэпрэзентатыўным сродкам мадэлявання адукацыйных парадыгм у гістарычнай рэтраспектыве іх развіцця.

## Літаратура


*Фонды навукова-даследчага аддзела рукапісаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі (г.Масква)*

1. Ф. 55 Волкович, В.А. «Введение в психологию нации» (1915 г.), лл. 1-9.
2. Ф. 55 Волкович, В.А. «Национальное воспитание как задача гармонического развития» (2.IV.1912 г.) , 26 лл.
3. Ф. 55 Волкович, В.А. «Национальный воспитатель Константин Дмитриевич Ушинский» (1913 г.), 127 лл., л. 184
4. Ф. 55 Волкович, В.А. «О проекте построения новой, идеальной русской школы, на основании так называемой философии новой русской школы» (1907 г.)
5. Волков С.В. Высшее чиновничество Российской империи.Краткий словарь.–М.:Русский фонд содействия образованию и науке, 2016. – 800 с.
6. Снапковская, С.В. Развитие образования и педагогической мысли Беларуси: вторая половина XIX – начало XX вв. / С. В. Снапковская. – М.: ИТИП РАО, 2011. – 308 с.